Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (124), 2021

*УДК [94+912.43]:930.2(476)*

# Крыніцазнаўства картаграфічных дакументаў і праблемы даследавання карт у савецкай і сучаснай беларускай гістарычнай навуцы

А.А. Лукашоў

Крыніцазнаўства картаграфічных дакументаў на тэрыторыі былога СССР стала развівацца, галоўным чынам, толькі пасля рэвалюцыі, найбольш інтэнсіўна – пасля Вялікай Айчыннай вайны. Да нядаўняга часу крыніцазнаўчыя працы у асноўным тычыліся адносна нешматлікіх картаграфічных дакументаў перыядаў Старажытнага свету, Сярэдневечча і Новага часу. А шматлікія картаграфічныя дакументы Найноўшай гісторыі як крыніца вывучалася значна менш. Важнай праблемай, з якой сутыкаюцца даследчыкі картаграфічных дакументаў, з’яўляецца недасканаласць навукова-даведачнага апарату архіваў, які звычайна не прыстасаваны да каталагізацыі такой спецыяльнай крыніцы, як карты.
**Ключавыя словы:** крыніцазнаўства картаграфічных дакументаў, картаграфічныя публікацыі, крыніцы па гісторыі Беларусі, навукова-даведачны апарат архіваў.

The source study of cartographic documents in the former USSR began to develop after the revolution, but most intensively – after the Great Patriotic War. Until recently, source studies mainly concerned relatively few cartographic documents from the periods of the Ancient World, the Middle Ages and the New Age. And many cartographic documents of recent history as a source have been studied significantly less.
**Keywords:** source study of cartographic documents, cartographic publications, sources on the history of Belarus, scientific reference apparatus of archives.

**Уводзіны.** Для стварэння картаграфічных публікацый па гісторыі Беларусі на высокім навуковым узроўні асабліва актуальным з’яўляецца асэнсаванне сучаснага стану такой спецыфічнай галіны крыніцазнаўства, як даследаванне картаграфічных матэрыялаў. Увядзенне у навуковы абарот гістарычных карт вельмі важна для развіцця гістарычнай геаграфіі, для якой картаграфічны артыфакт – самая каштоўная крыніца. Агляд навуковых публікацый, якія маюцца па гэтай тэме паказвае, што вывучэннем такой вузкаспецыяльнай крыніцы займаецца (ці займалася) даволі вузкае кола даследчыкаў. Аналізу вынікаў іх працы і прысвечаны дадзены артыкул.

**Асноўная частка.** Картаграфічнае крыніцазнаўства з’яўляецца адносна новай спецыяльнай гістарычнай дысцыплінай. Адзначаецца, што да рэвалюцыі, нягледзячы на шырокае выкарыстанне карт для напісання розных работ па гісторыі Расійскай імперыі (часткай якой на той момант былі беларускія землі), спецыяльных работ па картаграфічнаму крыніцазнаўству не было [1, с. 18], [2, с. 450]. Нават у рамках гістарычнай навукі СССР, з яе вельмі значнымі здабыткамі, даследаванне гістарычных карт бярэ пачатак у 1940-я гг., якое актывізавалася ў 1960-я. Прычым пачыналася гэта праца з даследавання карт даіндустрыяльнай эпохі [1 с. 4–5], [3, с. 18]. Гэта лагічна, паколькі менавіта ў старажытных картах можна знайсці звесткі пра буйныя па маштабу з’явы, пра якія іншыя крыніцы даюць толькі адрывачныя дадзеныя. Даследаванне карт на тэрыторыю Беларусі доўгі час адбывалася ў рамках даслевавання карт па гісторыі Расіі і СССР. Да таго, ж даследаванне карт у часы існавання СССР стрымлівалася абмежаваннямі на выкарыстанне і публікацыю картаграфічных матэрыялаў з прычын сакрэтнасці. Зазначаецца, што ў савецкія часы на карты XVIII–XIX стст. распаўсюджваліся амаль тыя ж самыя рэжымныя абмежаванні, што і на сучасныя [4, с. 7–8, 173]. У дастаткова ёмістай працы буйнога савецкага даследчыка, прысвечаный дарэвалюцыйнай картаграфіі, разгляд картаграфічных крыніц у храналагічным плане завяршаецца канцом XIX ст., нават не ўзгадваючы Першую сусветную вайну [5, с. 194–195]. Калі параўноўваць стан айчыннага крыніцазнаўства картаграфічных матэрыялаў з замежным, то можна зазначыць, што пачатак даследавання карт у далёкім замежжы звязваецца з пачаткам XIX ст., а найбольшы рост цікавасці да старажытных карт адбываецца ў другой палове XX ст. А.В. Постнікаў адзначае, што замежныя даследчыкі найбольшую

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цікавасць праяўляюць да больш ранніх перыядаў гісторыі картаграфіі, прычым гэтыя работы, часта напісаныя менавіта географамі і картографамі, асвячаюць пытанні, звязаныя з задавальненнем патрэб калекцыянераў і цікавасці з боку шырокай грамадскасці да гісторыі карт і карта-вытворчасці, а не крыніцазнаўства [6, с. 4–5, 7].

Паколькі для дасканалага вывучэння картаграфічных гістарычных дакументаў неабходна разуменне агульнай гісторыі картаграфіі, то шэраг фактаў на гэту тэму можна пачэрпнуць з даследаванняў П.П. Папкоўскага, Ф.А. Шыбанава, Л.С. Багрова, З.К. Навакшанавай-Сакалоўскай, В.Ф. Крэмпольскага [7]–[11]. Некаторыя даследчыкі выказваюць меркаванне, што маруднае даследаванне ў галіне картаграфічнага крыніцазнаўства ў значнай ступені звязана з недасканаласцю навукова-даведачнага апарату архіваў. Буйныя савецкія даследчыкі карта-дакументаў, такія як Л.А. Гольдэнберг і С.І. Сотнікава, зазначалі, што існуючыя схемы класіфікацыі разнародных (у пераважнай большасці тэкставых) архіўных дакументаў мала прыдатныя для сістэматызацыі картаграфічных матэрыялаў. А многія прыкметы, якія выкарыстоўваюцца для класіфікацыі сучасных карт, губляюць сваё значэнне пры ажыццяўленні класіфікацыі рукапісных архіўных карта-матэрыялаў [1]. Таму даследаванні карта-дакументаў у межах савецкай навукі былі пачаты з распрацоўкі тэорыі іх класіфікацыі і фарміравання спецыяльнага навукова-даведачнага апарату [4, с. 95]. Пры гэтым у многіх крыніцазнаўчых работах праблема спецыфікі картаграфічных крыніц не разглядаецца нават у тых выпадках, калі картаграфічныя матэрыялы ўзгаданы ў назве фонду ці калекцыі дакументаў [12], [13].

Сярод розных пытанняў, разгледжаных крыніцазнаўцамі падчас вывучэння карта-матэрыялаў можна вылучыць грунтоўную тыпалагізацыю гістарычных карт, праведзеную ў падручніку для вузаў В.В. Медушэўскай [3]. Праблемы класіфікацыі картаграфічных гістарычных дакументаў разглядаліся таксама ў асобных артыкулах Л.Л. Смактуновіча. Л.Р. Бяскроўны, вывучаючы змест рускіх дарэвалюцыйных карт па ваеннай гісторыі розных часоў, зрабіў ацэнку ўзроўню іх уведзенасці ў навуковы абарот і апублікаванасці [2]. Праблемы датыроўкі рукапісных карт разглядаліся А.І. Андрэевым у яго фундаментальнай працы «Очерки по источниковедению Сибири» [14]. Крыніцазнаўчыя работы А.І. Андрэева, Л.А. Гольдэнберга, В.В. Медушэўскай аналізуюць змест рускіх карт XVII–XVIII стст., у значна меншай ступені – XIX ст. Адносна добра аказаліся вывучанымі картаграфічныя крыніцы XVII ст. па гісторыі Сібіры. Даследаванні А.І. Андрэева, В.В. Медушэўскай, Л.Л. Смактуновіча, Е.І. Сотнікавай і іншых насілі ў значнай ступені архівазнаўчы характар. Яны, у прыватнасці, прыводзяць звесткі пра колькасць картаграфічных дакументаў, якія захоўваюцца ў архіўных установах Савецкага Саюза, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, колькасць картаграфічных дакументаў у архівах Гродзенскай і Віцебскай абласцей у сярэдзіне 1980-х гадоў ацэньвалася імі ў некалькі тысяч адзінак у кожнай (па розных тэмах і перыядах). У гістарычных архівах рэспублік Прыбалтыкі, па тых жа падліках, знаходзіцца некалькі дзесяткаў тысяч карт, а ў Цэнтральным дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве СССР (зараз Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў) – больш за 100 000 карт [15, с. 95]. Л.А. Гольдэнберг паведамляе пра 20 000 рукапісных карт, якія захоўваюцца ў дадзеным архіве [1, с. 17]. Калі лічыць, што падлікі Л.А. Гольдэнберга і Е.І. Сотнікавай дакладныя, то атрымоўваецца, што 20 % карт Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва рукапісныя, а 80 % – выдадзеныя друкарскім спосабам.

Сярод вышэй названых работ можна спыніць увагу на манаграфіі Л.Р. Бяскроўнага, якая прысвечана агляду гістарычных крыніц ад часоў Кіеўскай Русі да пачатаку XX ст. (уключаючы Першую сусветную вайну) [2]. Кніга аб'ёмам 454 старонкі складаецца з сямі глаў, у адпаведнасці з прапанаванай аўтарам перыядызацыі расійскай ваеннай гісторыі (да IX ст., IX–XI стст., XII–XIV стст., XIV–XVII стст., XVIII ст., першая палова XIX ст., другая палова XIX – пачатак XX ст.). 4–7 главы заканчваюцца невялікімі (2–5 старонак) параграфамі пад назвай «ваенная картаграфія» ці «картаграфічныя матэрыялы», у якіх апісваецца, на якія ваенныя падзеі і ў якіх архівах захаваліся картаграфічныя дакументы. З даследавання Л.Р. Бяскроўнага вынікае, што адносна нешматлікія ваенна-аператыўныя карты па расійскай гісторыі да XX ст. (частка якіх датычыцца тэрыторыі Беларусі) у асноўным уведзены ў навуковы абарот і часткова апублікаваны. А масівы картаграфічных дакументаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Першай сусветнай вайны застаюцца неапрацаванымі [2, с. 450]. Згадваюцца і найважнейшыя падзеі, на якія не захавалася карт. У прыватнасці, зазначаецца, што зусім няма расійскіх карт, якія датычацца адступлення расійскіх войскаў летам 1812 г., а па Барадзінскаму сражэнню 1-я справаздачная карта была складзена Барклаем дэ Толі (які выконваў функцыі вярхоўнага галоўнакамандуючага расійскай арміяй 7(19).07–21.09.(3.10)1812 г.) толькі ў 1814 г. [2, с. 346–347]. Аналіз зместу саміх карт праведзены вельмі бегла, аўтар толькі зазначае, што справаздачныя схемы баявых дзеянняў з'яўляюцца добрай ваенна-гістарычнай крыніцай: «Яны больш поўна адлюстроўваюць ход падзей, чым рэляцыі» [2, с. 228].

У цэлым, даследаванні картаграфічных крыніц па гісторыі Беларусі рознага перыяду на дадзены момант існуюць, у асноўным, на перыяд да XX ст. Пасля развалу сацыялістычнай сістэмы стала ажыццяўляцца даследаванне гістарычных карт не толькі расійскага, але і еўрапейскага паходжання [16]–[21]. Акрамя таго, асобныя пытанні крыніцазнаўства гістарычных карт разгледжаны ў гістарычных працах М.Ф. Спірыдонава, В.М. Цемушава, С.М. Цемушава, Я.К. Анішчанка, В.Л. Насевіча і інш., але гэтыя працы датычацца таксама перыяду да XX ст.

Тое, што спецыяльныя працы, прысвечаныя вывучэнню картаграфічных крыніц ваенных падзей XX ст. з'яўляюцца адзінкавымі, сведчыць пра іх нізкі ўзровень уведзенасці ў навуковы абарот. Фактычна маецца толькі пару значных работ, у якіх даецца пэўны агляд карта-дакументаў Найноўшай гісторыі. Гэта дысертацыі С.У. Кожына і А.А. Лукашова. Першая з іх прысвечана даследаванню пісьмовых крыніц па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў дакументальным фондзе Цэнтральнага музея Узброенных Сіл СССР [22]. Другая прысвечана даследаванню картаграфічных матэрыялаў партызан і падпольшчыкаў Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Картаграфічныя дакументы партызан і падпольшчыкаў Беларусі 1941–1944 гг. захоўваюцца ў некалькіх архівах і музеях, але найперш за ўсё ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, дзе па ацэнках аўтара захоўваецца больш за 10 тыс. карт [23]. Фонды Цэнтральнага музея Узброенных Сіл СССР (зараз Цэнтральны музей Узброенных Сіл Расійскай Федэрацыі) захоўваюць комплекс розных відаў дакументаў, у прыватнасці ваенна-аператыўных, якім прысвечаны асобны падраздзел работы С.У. Кожына. Сярод 510 ваенна-аператыўных дакументаў знаходзіцца 66 карт і 25 схем (як следуе з тэксту дысертацыі пад паняццем «схема» аўтар разумеў карта-схемы ці малюнкі мясцовасці) [22, с. 46].

Формай даследавання картаграфічных дакументаў з'яўляецца іх публікацыя ў спецыяльных атласах ці зборніках картаграфічных дакументаў з крыніцазнаўчымі каментарыямі [24]–[36]. У гэтых работах, у каментарыях да апублікаваных гістарычных карт, разглядаюцца паўната і дакладнасць паказу элементаў геаграфічнай сітуацыі, матэматычная аснова, змест тэматычных карт. Аналізуюцца магчымасці выкарыстання карт для правядзення даследаванняў і стварэння новых карт па гісторыі Беларусі. У выданнях работ гэтай групы аналіз дакументаў часта спалучаецца з папулярным характарам апісання карт. У храналагічным плане дыяпазон апублікаваных і разгледжаных у гэтых работах карт даволі шырокі – ад самых старажытных карт да карт пачатку XX ст. Большая частка карт, даследаваных і апісаных у гэтых кнігах і атласах, з'яўляюцца не рукапіснымі, а выдадзенымі. Змест карт аналізуецца праз прызму ўмоў стварэння выдання, асаблівасцей крыніц інфармацыі. Можна сказаць, што ў гэтых работах разглядаюцца, у асноўным, не асобныя карты, а іх выданні. Развіццё картаграфіі як навукі і вытворчасці ў XIX ст. дасягнула такога ўзроўню, што праводзіць маштабныя здымкі, падрабязна картаграфаваць вялікія тэрыторыі стала пад сілу толькі спецыялізаваным дзяржаўным картаграфічным арганізацыям. Цэнтралізацыя картаскладання вяла да сістэматызацыі і пэўнай ступені адзінства выкарыстоўваемых прыёмаў і метадаў. Не звязаныя са спецыялізаванымі дзяржаўнымі тапаграфічнымі арганізацыямі выдаўцы карт для падрыхтоўкі сваіх выданняў сталі, як правіла, выкарыстоўваць ужо апублікаваную картаграфічную інфармацыю. Таму работы па даследаванню карт другой паловы XIX–XX ст. у значнай ступені засяроджваліся на даследаванні генезісу картаграфічнай інфармацыі розных выдаўцоў, выяўленні «крыніцы пазычання картаграфічнай інфармацыі».

**Высновы.** Такім чынам, сістэматычнае вывучэнне картаграфіных крыніц у савецкай гістарычнай навуцы пачалося ў XX ст., асабліва пасля Вялікай Айчыннай вайны. Перш за ўсё савецкія крыніцазнаўцы звярнулі ўвагу на самыя старыя рускія картаграфічныя творы XVI–

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

XIX стст. На аснове іх вывучэння былі зроблены шырокія высновы пра асаблівасці карт як віда крыніцы, пра неабходнасць распрацоўкі спецыяльных метадаў іх даследавання, былі прапанаваны прынцыпы класіфікацыі карта-матэрыялаў. Шмат увагі было ўдзелена праблемам захаванасці і каталагізацыі картаграфічных дакументаў, паколькі інфармацыйна-даведачны апарат архіваў аказаўся мала прыстасаваны для эфектыўнага пошуку карта-матэрыялаў. Крыніцазнаўцы адзінадушны ў тым, што ваенныя карты ХХ ст. – найменш даследаваная, можна сказаць, мала закранутая сістэматычным вывучэннем група дакументаў, хоць і з'яўляецца адной з найбольш шматлікіх па колькасці адзінак.

Пасля 1991 г. істотна актывізавалася вывучэнне картаграфічных крыніц беларускімі гісторыкамі. Да нядаўняга часу беларускімі крыніцазнаўцамі у асноўным вывучаліся і публікаваліся дарэвалюцыйныя гістарычныя карты – не самая шматлікая па колькасці адзінак, але даволі цікавая група карт, звязаная з гісторыяй ВКЛ і першымі творамі картаграфіі як расійскага, так і еўрапейскага паходжання. Аднак шматлікія карта-дакументы Найноўшай гісторыі толькі пачалі вывучацца як гістарычная крыніца. Таму, даследаванне картаграфічных матэрыялаў, асабліва ХХ ст., можна назваць аднім з самых перспектыўных накірункаў гістарычных даследаванняў.

## Літаратура


1. Гольденберг, Л. А. С. У. Ремезов и картографическое источниковедение Сибири второй половины XVII – начала XVIII в. : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 08.00.10 ; 08.00.05 / Л. А. Гольденберг. – М. : Недра, 1967. – 32 с.
2. Бескровный, Л. Г. Очерки по источниковедению военной истории России / Л. Г. Бескровный. – М. : Из-во Академии наук, 1957. – 454 с.
3. Медушевская, О. В. Картографические источники XVII–XVIII вв. / О. В. Медушевская. – М. : Изд-во Московского гос. ист.-арх. инс-та, 1957. – 28 с.
4. Постников, А. В. Карты земель российских: очерк географического изучения и картографирования нашего отечества / А. В. Постников. – М. : «Наш дом» – «L'Age d'Homme», 1996. – 194 с.
5. Быковский, Н. М. Картография. Исторический очерк / Н. М. Быковский. – Петроград : Печатный двор, 1923. – 208 с.
6. Постников, А. В. Развитие картографии и вопросы использования старых карт / А. В. Постников. – М. : Наука, 1985. – 216 с.
7. Попковский, П. П. Из истории геодезии, топографии и картографии в России / П. П. Попковский. – М. : Наука, 1983. – 160 с.
8. Шибанов, Ф. А. Очерки по истории отечественной картографии / Ф. А. Шибанов. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1971. – 160 с.
9. Багров, Л. С. История русской картографии / Л. С. Багров. – М. : Центрполиграф, 2005. – 522 с.
10. Новокшанова-Соколовская, З. К. Картографические и геодезические работы в России / З. К. Новокшанова-Соколовская. – М. : Наука, 1967. – 268 с.
11. Кремпольский, В. Ф. История развития картоиздания в России и СССР / В. Ф. Кремпольский. – М. : Геодезиздат, 1959. – 111 с.
12. Лисова, Л. М. Документы по истории войны 1812 г. в Национальном историческом архиве Беларуси, Российском государственном военно-историческом архиве, Центральном государственном историческом архиве Украины / Л. М. Лисова // Дакументальная спадчына Беларусі : матэрыялы навук.-практ. канф., прысвечанай 75-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Мінск, 26 чэрв. 2013 г. / Дэпартамент па архівах і справаводству Мінюста РБ, НГАБ ; рэдкал.: У. І. Адамушка (старшыня) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 92–97.
13. Лабазнова, Т. В. Развитие научно-справочного аппарата в 1993–2013 гг. в государственных архивах Республики Беларусь / Т. В. Лабазнова // Дакументальная спадчына Беларусі : матэрыялы навук.-практ. канф., прысвечанай 75-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Мінск, 26 чэрв. 2013 г. / Дзепартамент па архівах і справаводству Мінюста РБ, НГАБ ; рэдкал.: У. І. Адамушка (старшыня) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 253–258.
14. Андреев, А. И. Очерки по источниковедению Сибири / А. И. Адреев. – Л. : Изд-во Главсевморпути, 1939. – 184 с., вкл. л. илл.: карт. и факс.
15. Проблемы классификации в архивоведении и документоведении : сб. науч. ст. / Главархив СССР, ВНИИДАД СССР ; редкол.: В. Н. Автократов (отв. ред.) [и др.]. – М., 1987. – 183 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

16. Лукашэвіч, А. М. Беларускія землі на картах канца XVIII – пачатку XX ст. / А. М. Лукашэвіч // Працы гіст. фак-та БДУ: навук. зборнік. – Мінск, 2015. – Вып. 10. – С. 212–222.

17. Казлоў, Л. Р. Картаграфічныя крыніцы па гісторыі Беларусі XIX ст. / Л. Р. Казлоў. // Проблемы методологии исследований истории Беларуси : материалы Международной научной конференции, Минск, 26–27 октября 2006 г. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2008. – С. 246–249.

18. Картографические материалы в Национальном историческом архиве Беларуси. Минская губерния / Департамент по архивам и делопроизводству Минюста РБ, Национальный исторический архив ; сост. А. Н. Можейко [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Беларусь, 2015. – 589 с.

19. Казлоў, Л. Р. Картаграфічныя крыніцы да гісторыі і гістарычнай геаграфіі Беларусі XIX ст. / Л. Р. Казлоў // Теоретические и практические проблемы документоведения и архововедения : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 2–3 дек. 2015 г. / Департамент по архивам и делопроизводству Минюста РБ, БелНИИДАД, НИАБ, Истфак БГУ ; редкол.: В. С. Поздняков [и др.]. – Минск, 2016. – С. 121–127.

20. Козлов, Л. Р. Российская военная топография XIX в. – важнейший источник по истории Беларуси / Л. Р. Козлов. – М. : Институт славяноведения, 2003. – 16 с.

21. Ширяев, Е. Е. Беларусь : Русь Белая, Русь Чёрная и Литва / Е. Е. Ширяев. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 118 с.

22. Кожин, С. В. Письменные источники по истории Великой Отечественной войны в документальном фонде Центрального музея вооружённых сил СССР : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.09 / С. В. Кожин. – М., 1988. – 197 с.

23. Лукашоў, А. А. Картаграфічныя матэрыялы партызан і падпольшчыкаў Беларусі (1941–1944 гг.) як гістарычная крыніца вывучэння Вялікай Айчыннай вайны : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.09 / А. А. Лукашоў. – Мінск, 2014. – 172 л.

24. Казлоў, Л. Р. Беларусь у працах польскіх картографаў (XVI–XX стст.) / Л. Р. Казлоў. – Мінск : Арты-Фэкс, 2004. – 122 с.

25. Казлоў, Л. Р. Беларускае Палессе на старажытных картах (навукова-папулярны нарыс) / Л. Р. Казлоў. – Мінск : Арты-Фэкс, 2006. – 65 с.: іл.

26. Казлоў, Л. Р. Старажытная картаграфія Беларусі [Карты]: атлас: у 3 вып. / Л. Р. Казлоў. – Мінск : Арты-Фэкс, 2005–2009. – Вып. I : Старажытная картаграфія Беларусі [Карты:]. – 2005. – 1 атл. (46 с.): 1 цв., карты, тэкст. – Вып. II : Старажытная картаграфія Беларусі [Карты:]. – 2006. – 1 атл. (41 с.): 1 цв., карты, тэкст. – Вып. III : Старажытная картаграфія Беларусі [Карты]. – 2009. – 1 атл. (45 с.): 1 цв., карты, тэкст.

27. Куфтерин, Э. В. Великое княжество Литовское на географических картах : визуальные образы / Э. В. Куфтерин ; науч. ред. О. И. Дернович. – Минск : Экономпресс, 2014. – 68 с.

28. Казлоў, Л. Р. Картаграфія Беларусі пад час паўстання 1863–1864 гг. / Л. Р. Казлоў. – Мінск, 2003. – 16 с.

29. Казлоў, Л. Р. Паміж горадам і вёскай : (картаграфічныя крыніцы па гісторыі мястэчак Гарадзеншчыны ў XIX – пачатку XX ст.) / Л. Р. Казлоў // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры : зб. навук. артыкулаў / Міністэрства адукацыі РБ, Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я. Купалы ; рэдкал.: Т. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адказныя рэдактары) [і інш.]. – Гродна, 2007. – С. 56–60.

30. Волкаў, М. А. Слуцк на старых планах / М. А. Волкаў ; навук. рэд. Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : Беларусь, 2017. – 159 с.

31. Беларускія землі на картах XVII – другой паловы XVIII ст. : карты / складальнік нарыса Л. Р. Казлоў. – Мінск : Белкартаграфія, 2019. – 44 с.

32. Рэпрадукцыі старажытных карт : карты / складальнік нарыса В. Л. Насевіч. – Мінск : Белкартаграфія, 2019. – 40 с.

33. Вялікі гістарычны атлас Беларусі : у 4 т. / рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Белкартаграфія, 2009–2018. – Т. 4. – 2018. – 268, [3] с.

34. Гістарычны атлас Беларусі / М. Ф. Спірыдонаў [і інш.] ; рэдкал.: В. М. Мікалаевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск–Варшава : EEDC–BHR, 2008. – 164 с.

35. Polonia: Atlas map z XVI–XVIII wieku / S. Alexandrowicz [i inny] ; redakcja: I. Krauze-Tomczyk (redaktor naczelny) [i inny]. – Warszawa : Glowny Urzad Geodezji i Kartografii, 2005. – 54 с.

36. Казлоў, Л. Р. Беларусь на сямі рубяжах (XI – пачатак XX стст.) / Л. Р. Казлоў. – Мінск : Арты-Фэкс, 1998. – 35 с.

Барановичский государственный университет Поступила в редакцию 03.11.2020

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ